# Указ
# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

31 снежня 2024 г. № 484 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2024 года:

калектыву дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы ”Маладзёжны тэатр эстрады“ – за значныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

калектыву дзяржаўнай установы ”Гомельскі дзіцячы сацыяльны пансіянат ”Шчаслівыя ўсмешкі“ – за развіццё творчага патэнцыялу дзяцей і маладых людзей з інваліднасцю, інтэграцыю інклюзіўнага мастацтва ў культурную прастору краіны;

калектыву ў складзе Ачапоўскай Вольгі Мікалаеўны, начальніка бюро галоўных інжынераў праекта адкрытага акцыянернага таварыства па комплексным праектаванні аб’ектаў жыллёва-грамадзянскага прызначэння ”Інстытут Гомельграмадзянпраект“, Заяц Вікторыі Мікалаеўны, загадчыка навукова-асветніцкага аддзела ўстановы ”Гомельскі абласны музей ваеннай славы“, Хлебавец Зінаіды Мікалаеўны, загадчыка філіяла ”Мемарыяльны комплекс вязням Азарыцкага лагера смерці“ дзяржаўнай установы культуры ”Калінкавіцкі краязнаўчы музей“, – за асабісты ўклад у рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу ў памяць аб вязнях Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне Гомельскай вобласці;

калектыву ўстановы адукацыі ”Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў“ – за плённую працу ў галіне навучання і выхавання творчай моладзі, актыўную грамадска-патрыятычную дзейнасць;

калектыву ўстановы адукацыі ”Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі“ – за значныя дасягненні ў патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення, арганізацыю работы Паста № 1 горада-героя Мінска па нясенні Ганаровай Вахты Памяці;

Лапковай Таццяне Анатольеўне, загадчыку аддзела традыцыйнай культуры дзяржаўнай установы ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, – за асабісты ўклад у захаванне і папулярызацыю тэхналогіі аплятання бяростай ганчарнага посуду (берасцянікаў);

Магілёўскай абласной арганізацыі грамадскага аб’яднання ”Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі“, рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству радыётэлецэнтру ”Тэлерадыёкампанія ”Магілёў“, установе культуры ”Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е.Р.Раманава“ – за рэалізацыю міжнароднага маладзёжнага патрыятычнага праекта ”Дарогамі Памяці і Славы“;

Шавельскай Ірыне Францаўне, майстру народных мастацкіх рамёстваў аддзела этнаграфіі, фальклору і рамёстваў дзяржаўнай установы культуры ”Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр“, – за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю традыцыйных рамёстваў, адраджэнне народных тэхналогій саломапляцення.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2024 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы спецыяльных прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ АДМИНИСТРАЦИЯ • 1 • Для правовых актов

10